Литература
1. Государственная программа инновационного развития Республики Беларусь на 2016–2020 годы: Указ Президента Республики Беларусь, 31 янв. 2017 г., № 31 [Электронный ресурс] // http://gknt.gov.by/deyatelnost/innovatsionnaya-politika/gpir/
2. Сенашенко В.С., Кузнецова В.А., Кузнецов В.С. О компетенциях, квалификации и компетентности // Высшее образование в России. 2018. № 6.
3. Кирдянкина С.В. Обновление механизмов управления образовательным учреждением в контексте компетентностного подхода // Высшее образование в России. 2016. № 2.
4. Г.В. Лаврентьев, Н.Б. Лаврентьева Инновационные обучающие технологии в профессиональной подготовке специалистов. Технология модульного обучения - основа построения электронного учебно-методического комплекса // [Электронный ресурс]

УДК 378.026:81

## ДА ПЫТАННЯ АБ СПЕЦЫФІЦЫ ВЫКЛАДАННЯ ДЫСЦЫПЛІНЫ «КУЛЬТУРА ПРАФЕСІЙНЫХ ЗНОСІН» У ТЭХНІЧНАЙ УСТАНОВЕ ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫІ

**Занкавіч А.П.,** к.філал.н., дацэнт, **Грынцэвіч Т.І.,** к.філал.н., дацэнт
БДАГУ, г. Мінск, Республика Беларусь

Задача фарміравання навыкаў і ўменняў прафесійных зносін стала асабліва актуальнай у апошнія дзесяцігоддзі. Сучаснаму спецыялісту важна ўмець будаваць вуснае выказванне, разумець і адэкватна рэагаваць на чужую гаворку, пераканаўча адстойваць уласную пазіцыю, захоўваючы маўленчыя і этыка-псіхалагічныя правілы паводзін. Зносіны адыгрываюць важную ролю ў розных відах прафесійнай дзейнасці, але асаблівую значнасць яны набываюць для людзей, занятых у кіраванні.

Дзелавым людзям пастаянна даводзіцца мець зносіны з асобамі, якія стаяць на розных прыступках іерархічнай лесвіцы, а таксама з калегамі і супрацоўнікамі аднаго ўзроўню.

Уменне знайсці аптымальны варыянт дзелавых узаемаадносін па вертыкалі і па гарызанталі – вялікае мастацтва. Выбар адпаведнай траекторыі адносін ўваходзіць у камунікатыўную кампетэнтнасць асобы. Асноўная мэта дысцыпліны «Культура прафесійных зносін» у тэхнічнай установе вышэйшай адукацыі – падрыхтоўка выпускнікоў да паспяховых зносін у сферах вытворчасці і АПК пры правядзенні гутарак, перамоваў, нарад; фарміраванне маўленчых навыкаў вуснага дзелавога кантакту; авалоданне псіхалагічнай культурай і этыкай службовага ўзаемадзеяння.

Асноўныя задачы, якія стаяць перад выкладчыкам:
– павышэнне маўленчай культуры;
– засваенне практычных прыемаў пераканання;
– навучанне кваліфікаванаму вядзенню дзелавых гутарак, перамоваў;
– фарміраванне навыкаў прафесійнага адстойвання поглядаў у спрэчках, дыскусіях;
– навучанне рацыянальнай і эфектыўнай тэхналогіям падрыхтоўкі і вымаўлення публічных прамоў;
– навучанне стратэгіям паводзін у канфліктных сітуацыях;
– навучанне выкарыстанню норм этыкі дзелавых зносін.

Падрыхтоўка спецыяліста ў рамках вучэбнай дысцыпліны «Культура прафесійных зносін» павінна забяспечыць фарміраванне асноўнай кампетэнцыі – прымяненне базавых навыкаў камунікацыі ў вуснай і пісьмовай формах для рашэння задач міжасобасных і прафесійных зносін.

Пры выкладанні дысцыпліны неабходна выкарыстоўваць сучасныя педагагічныя методыкі і тэхналогіі, якія спрыяюць самастойнаму пошуку студэнтамі ведаў.

Пры засваенні вучэбнай дысцыпліны студэнты павінны ведаць:
- культуру маўлення і маўленчы этыкет;
- асаблівасці дыялагічнай прамовы;

- асаблівасці публічнага выступлення;
- правілы вядзення спрэчкі, дыскусіі;
- агульныя прынцыпы і нормы этыкетнай культуры;
- асаблівасці культуры ў прафесійнай сферы;
- этыкет кіраўніка і падначаленага.

Студэнт павінен умець:

- выкарыстоўваць правілы падрыхтоўкі, пабудовы маналагічнай прамовы і выступлення з ёю;
- будаваць сваю прамову ў адпаведнасці з патрабаваннямі маўленчай культуры і маўленчага этыкету;
- выкарыстоўваць моўны этыкет зваротаў ветлівасці ў службовых сітуацыях;
- выслухоўваць суразмоўцаў і рабіць крытычныя заўвагі, весці гутарку па тэлефоне;
- будаваць вуснае выказванне, ужываючы практычныя прыёмы пераканання;
- весці дыялог у адпаведнасці з абранымі мэтамі;
- пераканаўча адстойваць сваю пазіцыю ў спрэчках і дыскусіях.

Дысцыпліна «Культура дзелавых зносін» базіруецца на ведах, уменнях і навыках, атрыманых студэнтамі пры вывучэнні сацыяльна-гуманітарных дысцыплін: «Беларуская мова (прафесійная лексікі)», «Справаводства», а таксама арыентавана на прафесійныя патрэбы спецыялістаў АПК.

Канцэпцыя бесперапыннага адукацыйнага працэсу патрабуе адпаведнай сістэмы ведаў. Развіццё навыкаў дзелавых і міжасобасных зносін становіцца неабходным для спецыялістаў і кіраўнікоў розных устаноў. Пры сучасным дынамізме жыцця неабходна прытрымлівацца правіл этыкету, што, безумоўна, дапаможа закласці фундамент у паляпшэнне ўзаемаадносін паміж людзьмі.

На любых пасадах, якія патрабуюць асабістага кантакту, паспяховая камунікацыя становіцца рашаючым фактарам. Веданне дзелавога этыкету дапамагае палепшыць камунікацыю, устанавіць дзелавыя кантакты, садзейнічае дасягненню ўзаемаразумення, стварае добрыя, устойлівыя адносіны з партнёрамі і канкурэнтамі.

Неабходнасць авалодання культурай прафесійных зносін абумоўлена тым, што афіцыйныя зносіны пранікаюць ва ўсе сферы жыцця. Уменне наладжваць кантакты з людзьмі, паспяхова весці перагаворы, працаваць з дакументамі – важнейшы элемент культуры сучаснага адукаванага чалавека, які імкнецца дасягнуць поспехаў у жыцці.

УДК 378:004

# ПОДГОТОВКА БУДУЩЕГО СПЕЦИАЛИСТА ПРИ ПЕРЕХОДЕ К ИНФОРМАЦИОННОМУ ОБЩЕСТВУ

**Карпович А.М.**
БГАТУ, г. Минск, Республика Беларусь

Система образования представляет собой наиболее консервативный социальный институт, который существует в рамках форм, методов и способов организации деятельности, сформированных в 16-17 веках. Бурное развитие науки и техники не оказывало значительного влияния на процессы, происходящие при обучении. Каждый новый этап развития приводил лишь к изменению технической базы процесса преподавания. Улучшалось качество и уровень технического обеспечения процесса преподавания, но формы, методы и способы организации деятельности преподавателя и обучаемого оставались неизменными. [1]

Однако развитие коммуникативных технологий привело к тому, что потребности промышленности вошли в противоречие, как с процессом преподавания, так и с возможностями самого человека. Современная система образования является одной из важнейших характеристик, которые определяют независимость и стабильность страны. Человеческий потенциал выходит на первый план, оставляя за собой все материальные ресурсы. Развитие информаци-